# Выхаванне навучэнцаў праз далучэнне да дэкаратыўна-прыкладной творчасці

## Вопыт педагагічнай дзейнасці

**В. В. Пазднякова,**
настаўнік выяўленчага мастацтва вышэйшай катэгорыі

Сучаснае грамадства зацікаўлена не толькі ў высокакваліфікаваных, але і творчых людзях, усебакова развітых асобах, якія імкнуцца дасягнуць поспеху ў розных галінах дзейнасці.

Кожны чалавек таленавіты па-свойму. Задача педагога выявіць, што ў навучэнца атрымліваецца лепш, што яму больш падабаецца, цікавіць, і дапамагчы яму паверыць у сябе, дасягнуць сваёй вышыні, свайго п’едэсталу, знайсці свой любімы занятак, а магчыма, і будучую прафесію. У аб’яднанне па інтарэсах прыходзяць дзеці не толькі рознага ўзросту, але і рознай ступені падрыхтаванасці, з сем’яў з розным матэрыяльным дастаткам і духоўным ладам жыцця. Задача педагога стварыць калектыў, у якім будзе камфортна кожнаму; вучыць дабрыні, працавітасці, шчырасці, адказнасці, акуратнасці. І галоўнае, знайсці тыя педагагічныя інструменты, якія дапамогуць праявіць свае скрытыя творчыя здольнасці не толькі «моцнаму», але і «дрэннаму» матэматыку ці хіміку. Праявіць свае магчымасці і падзяліцца вынікамі з іншымі, каб усе атрымалі эстэтычнае задавальненне, а аўтар – радасць ад асэнсавання патрэбнасці, нават небходнасці сваёй работы і жаданне працаваць далей.

У «Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь» адзначаецца, што ўжо «ў дашкольным узросце ў дзіцяці адбываецца станаўленне патрэбнасці ў дасягненні поспехаў. Асаблівасцю працэсу выхавання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца

фарміраванне дзелавых якасцей у вядучых відах дзейнасці, замацаванне матыву дасягнення поспехаў, а фарміраванне самаацэнкі напрамую залежыць ад характару ацэнкі дарослымі дзіцяці і яго поспехаў ў розных відах дзейнасці. На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі галоўнымі матывамі асобаснага росту становяцца самапазнанне, самавыражэнне і самасцвярджэнне».

У жыцці мы часта гаворым пра людзей, якія дасягнулі пэўнага поспеху: у вучобе, палітыцы, спорце, рабоце, у навуцы ці творчасці. Феноменам поспеху цікавяцца псіхолагі, філосафы, сацыёлагі, педагогі. Х. Хекхаузен лічыць, што ў самай простай форме крытэрый паспяховасці – гэта супрцьлегласці «поспех – няўдача», «добра – дрэнна». Ідэя дасягнення сканцэнтравана вакол двух магчымасцей: дасягненне поспеху ці пазбяганне няўдачы.

З паняццем поспеху цесна звязана катэгорыя асобы, якая не толькі працуе, дасягае пастаўленай мэты, але і дае ацэнку сваёй дзейнасці. Я згодна з С. А. Пакулінай, што поспех – гэта «не толькі фенаменальны аб’ект, сам вынік, а перш за ўсё яго ацэнка і сэнс існавання для суб’екта, які складае змястоўную аснову матывацыйнай сферы асобы».

Такім чынам, поспех у дзейнасці залежыць не толькі ад здольнасці чалавека, але і ад імкнення дасягнуць мэты, гэта значыць ад матывацыі дасягнення. Чалавек з моцным матывам дасягнення поспеху імкнецца дасягнуць высокіх вынікаў, а чалавек са слабым матывам – пазбегнуць няўдачы, ён абыякавы да поспехаў і высокіх вынікаў.

Услед за С. І. Яфрэмавай я лічу, што пад поспехам трэба разумець станоўчы вынік дзейнасці суб’екта па дасягненні значымых для яго мэт, што адлюстроўвае сацыяльныя арыенціры грамадства, выступае формай самарэалізацыі суб’екта, забяспечвае яго самаразвіццё і мае на ўвазе ацэнку з боку грамадства ў форме адабрэння.

«З усіх відаў сучаснага народнага мастацтва Беларусі найбольшай папулярнасцю карыстаюцца якраз вырабы з саломы»,– напісаў у 2001 годзе Я. М. Сахута. І трэба прызнаць, што ў гэты час сапраўды ў Мінску было многа гурткоў па рабоце з саломкай. Аднак час ідзе і ўсё мяняецца. І зараз педагогі

адзначаюць, што ў дзяцей прападае цікавасць да заняткаў дэкаратыўна-прыкладной творчасцю, у тым ліку саломапляценнем. Адбываецца гэта, на маю думку, па розных прычынах:

- наяўнасць мноства тэхналагічных карт у розных сродках масавай інфармацыі: і бацькі, і дзеці лічаць, што калі захочуць, то змогуць зрабіць пэўную рэч сваімі рукамі ў любы момант;
- запоўненасць вырабамі (сувенірамі) прылаўкаў магазінаў і кіёскаў;
- таннасць гэтых рэчаў;
- недахоп часу;
- адсутнасць жадання стварыць падарунак сваімі рукамі;
- пэўнае нежаданне прымусіць сябе да працы (а трэба адзначыць, што і многія пляценкі не атрымліваюцца з першага разу, і добрую выцінанку, магчыма, трэба зрабіць з некалькімі «чарнавымі» варыянтамі);
- празмерная прысутнасць у паўсядзенным жыцці сучаснага дзіцяці камп'ютарнай тэхнікі і г.д.

І часта атрымліваецца так, што дзеці і іх бацькі больш цікавяцца і лепш ведаюць культуру іншых народаў, іншых краін і нават лічаць, што ўсе лепшае – гэта замежнае. А багатая культурная спадчына беларускага народа для іх застаецца малавядомай. «Народ бязмежна багаты ў сваей мастацкай творчасці. Вучыцеся ў народа», – сказаў класік беларускай літаратуры Якуб Колас. Дык як жа зрабіць так, каб, напрыклад, на факультатыўных занятках ці ў гуртку навучэнцы не проста выплятаі пляцёнку дзеля пляценкі ці для стварэння дробных, ва ўсіх падобных вырабаў, выразалі выцінанку не для таго, каб напрыканцы заняткаў яе выкінуць, а спяшаліся на заняткі з вялікім жаданнем; як жа зацікавіць сучаснага маленькага жыхара вялікага горада займацца старадаўнім народным рамяством; як зрабіць заняткі захапляльнымі, пазнавальнымі, патрэбнымі; як аб'яднаць групу дзяцей у моцны калектыў? Я паспрабавала вырашыць гэтыя супярэчнасці шляхам развіцця ў навучэнцаў матывацыі дасягнення поспеху праз стварэнне індывідуальных і калектыўных

творчых работ і ў далейшым – праз удзел з гэтымі работамі ў выстаўках, конкурсах і іншых мерапрыемствах.

**Вядучая ідэя вопыту:** павышэнне ўзроўню матывацыі дасягнення поспеху ў навучэнцаў, якія займаюцца саломапляценнем і выцінанкай, адбываеццца праз стварэнне непаўторных, прыгожых, творчых індывідуальных і калектыўных работ з мэтай удзелу ў конкурсах, выстаўках, майстар-класах і іншых мерапрыемствах ад школьна-раённага да міжнароднага этапаў.

Навізна дадзенага вопыту заключаецца ў незвычайным прымяненні вядомых прыёмаў і тэхнік выканання саламяных пляцёнак і выцінанак з мэтай афармлення творчых работ для ўдзелу ў конкурсах і дасягнення поспеху ў дадзенай галіне дзейнасці. Асаблівасцю выканання нашых работ з’яўляецца стварэнне пэўнага вобразу ці кампазіцыі шляхам аб’яднання ў адно цэлае мноства дробных элементаў. Гэта дае магчымасць бясконцай колькасці варыянтаў спалучэння розных па аб’ёме і форме дэталей у прыгожы, арыгінальны выраб.

Вучоныя сцвярджаюць, што матываваныя на поспех людзі імкнуцца ў сваёй дзейнасці дасягнуць высокіх вынікаў; яны ставяць перад сабой мэты, якіх рэальна могуць дасягнуць; лічаць свой поспех звязаным з унутраным фактарам, а няўдачу – з адсутнасцю намаганняў і пасля няўдачы паказваюць лепшыя вынікі, чым пасля поспеху. Яны плануюць сваё будучае на вялікія прамежкі часу; для іх высокая кваліфікацыя больш значная, чым сацыяльны прэстыж прафесіі.

Каб выхаваць такога чалавека, трэба стварыць, згодна з «Концепцией непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь», пэўныя ўмовы:

- ✓ творчае асяроддзе, што садзейнічае развіццю асобы на аснове значымых інтарэсаў;
- ✓ перажыванне сітуацыі поспеху, наяўнасці атмасферы бяспекі, даверу, прыняцця і эмацыянальнай падтрымкі;

✓ ствараемы і пераживаемы разам з педагогам вопыт асэнсавання сябе, сваіх адносін з сябрамі, перспектыў асобаснага росту.

У ДУА «Сярэдняя школа № 3 г. Мінска» такія ўмовы ствараюцца праз далучэнне навучэнцаў да дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў галіне саломапляцення і выцінанкі. З першага класа на заняткі да мяне прыходзяць навучэнцы, бацькі якіх зацікаўлены ў знаёмстве сваіх дзяцей з народным мастацтвам. На І ступені адукацыі навучэнцы працуюць з рознымі матэрыяламі згодна з праграмай факультатыўных заняткаў «Творчыя майстэрні». Аднак я імкнуся выявіць тых навучэнцаў, што праяўляюць асаблівую цікавасць да дэкаратыўна-прыкладной творчасці і прапаную ім паспрабаваць свае сілы ў школьных і раённых конкурсах. Потым запрашаю на факультатыўныя заняткі па выцінанцы і саломапляценні («Мастацтва выцінанкі» (5–6 клас); «Мастацкая апрацоўка саломкі» (5 клас); «Плетение из соломки» (7 клас)). Заняткі ў аб’яднанні па інтарэсах «Добры настрой» маюць магчымасць наведваць і навучэнцы ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Мастацтва выцінанкі – амаль забыты ў ХХ стагоддзі від народнай творчасці стварэння ўзораў з паперы. Часовае адраджэнне выцінанак адбылося ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Потым яны канчаткова зніклі. З канца ХХ стагоддзя выцінанка зноў адноўлена як від народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва. Дзеці, услед за дарослымі, ахвотна фантазіруюць з нажніцамі і даступным, лёгкім для апрацоўкі матэрыялам, задавальняючы свае мастацкія імкненні, ствараючы арыгінальныя вырабы.

Не менш арыгінальныя, прыгожыя вырабы ствараюць навучэнцы і з іншага таннага, лёгкага, пластычнага матэрыялу – саломы. Чысты залацісты колер, глянцавы бляск іржаной, пшанічнай, ячменнай саломы спрыяе з’яўленню вырабаў, якія не ўступаюць па прыгажосці і дэкаратыўнасці творчым работам з больш даўгавечных і дарагіх матэрыялаў.

Са сваімі творчымі работамі навучэнцы ўдзельнічаюць у школьным тыдні беларускай мовы і літаратуры, афармляючы выставу. У рамках гэтага тыдня мы, як правіла, праводзім віктарыны («Размаўляем па-беларуску»,

«Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, рамёствы і звычаі беларусаў» і іншыя), дзе стараемся падбіраць словы ці выразы, звязаныя з дэкаратыўна-прыкладной творчасцю **(Дадатак 1).**

Звычайна мы рыхтуем невялікія падарункі да свята першакласнікаў. Я думаю, у такі момант усе, хто працаваў і хто ўручае зроблены сваімі рукамі падарунак, адчувае значнасць, патрэбнасць сваёй работы.

Аднак з асаблівым гонарам і хваляваннем дораць навучэнцы свае работы былым выпускнікам нашай школы, людзям заслужаным, вядомым, паспяховым, якія завітваюць на сустрэчу са старшакласнікамі.

Кожны год мы знаёмім са сваёй творчасцю бацькоў будучых першакласнікаў, што наведваюць бацькоўскі сход, прысвечаны знаёмству са школай.

Работы навучэнцаў дэманструюцца на мерапрыемствах, якія праходзяць у нашай школе для настаўнікаў раёна і горада, напрыклад, у рамках майстар-класа для настаўнікаў горада Мінска «Культурныя традыцыі як умова інкультурацыі асобы» (2013г.).

У 2015 годзе мы ўпершыню правялі школьны конкурс па выцінанцы (1–6 класы) «Сустакаем Новы год». Усе разам – навучэнцы, бацькі, настаўнікі – вырашылі зрабіць конкурс традыцыйным. Гэта садзейнічае не толькі актывізацыі творчых магчымасцей навучэнцаў, але і іх актыўнаму ўдзелу ў афармленні памяшканняў школьнага будынка да навагодніх свят. Хачу адзначыць, што дзіцячыя работы здзівілі многіх дарослых дасканаласцю выканання, творчай задумкай, сур’ёзнасцю, з якой аднесліся да сваёй работы юныя ўдзельнікі конкурса.

Напрыканцы 2015–2016 навучальнага года ў школе быў праведзены конкурс па саломапляценні «Гэта дзіўная саламяная кветка». Камбінуючы розныя плоскія і аб’ёмныя пляцёнкі, навучэнцы стваралі пэўныя дэкаратыўныя кампазіцыі і расказвалі пра свае індывідуальныя ці калектыўныя работы. Дэманструючы іх, дзеці танцавалі ў саламяных галаўных уборах, упрыгожаных кветкамі, чыталі на памяць вершы, спявалі, ігралі на музычных інструментах,

паказвалі мультымедыйныя прэзентацыі, а Якжык Вераніка нават расказала казку, якую прыдумала сама, пра незвычайную кветку. «Папараць-кветка», «Дзюймовачка», велікодныя вербы, саламяныя «валянцінкі», светлафор з Рамашкава, касцюмы сучасных Купалінак – гэтымі і іншымі творчымі работамі навучэнцы не проста здзівілі – уразілі бацькоў, знаёмых і сяброў, а таксама журы, якое ўзначальвала старшы выкладчык педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, член праўлення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, кіраўнік секцыі саломапляцення пры ГА «БСМНТ» Алена Леанідаўна Папкоўская. Лічу, што высокая ацэнка дзіцячых работ, дадзеная спецыялістам, словы шчырай падзякі і захаплення, якія прагучалі ад гледачоў падчас завяршэння мерапрыемства, спрыялі ўмацаванню ў навучэнцаў веры ў свае сілы, жаданню многа і творча працаваць далей, імкненню дасягаць поспеху.

Вясной 2014 года па прапанове культурна-асветніцкага аддзела БНТУ пры падтрымцы ГА «БСМНТ» у выставачнай зале БНТУ «Берагіня» прайшла выстава «Каб вярталіся птушкі дамоў». Там дэманстраваліся мае работы і лепшыя работы навучэнцаў, выкананыя пад маім кіраўніцтвам. «Павукі», кветкі, пано, лялькі і больш за 40 саламяных птушак. На адкрыцці выставы, звяртаючыся да сваіх навучэнцаў, я гаварыла, што пройдзе час, яны атрымаюць добрую адукацыю, стануць прафесіяналамі ў пэўнай галіне дзейнасці і, магчыма, як птушкі, паляцяць у іншыя краіны. Але я жадаю, каб яны помнілі пра зямлю, якая іх узгадавала, і, нібы пералётныя птушкі, вярталіся пад чысты высокі блакіт беларускіх нябёсаў. Некалькі тыдняў работы радавалі наведвальнікаў выставы. Суджу пра гэта па водгуках студэнтаў, выкладчыкаў, выхавацеляў, бацькоў і майстроў з розных рэгіёнаў Беларусі, іншаземных гасцей. Словы ўдзячнасці, захаплення, шчырыя пажаданні творчых поспехаў, запісаныя ў кнізе водгукаў, – гэта і ёсць ацэнка работы дзяцей з боку дарослых у выглядзе адабрэння.

У гэтай жа выставачнай зале БНТУ штогод праходзіць міжнародная выстава «Радость Пасхи». Не адзін год навучэнцы гуртка «Добры настрой» прымаюць у ёй удзел. Рыхтуюцца асабліва старанна. Паштоўкі, вербы,

дэкаратыўныя яйкі, прыгожыя кошыкі на велікодны стол, кветкі, птушкі, выцінанкі з цэрквамі – архітэктурнымі помнікамі Беларусі, анёлы, – кожны выконвае сваю работу. Мачымасць удзельнічаць у дадзенай выставе разам з дарослымі – прызнанне высокага ўзроўню выканання, арыгігальнасці, цікавай творчай задумкі.

Амаль кожны год мы прымаем удзел у гарадскім выставе-конкурсе дзіцячай творчасці «Традыцыі і сучаснасць». Тэмы гэтага конкурса могуць быць розныя, тым цікавей дзецям удзельнічаць у ім. Пераможцамі конкурсу ў розныя гады былі Розум Кацярына і Саладуха Дзмітрый з работай «Церамок» паводле народных казак, калектыў з сямі навучэнцаў з работай «Гадкае качаня сярод жыхароў Птушынага двара» (тэма «Птушкі»); Сарока Дар'я і Сарока Кацярына з работай «Сарокі-траскатухі» і Маслоўская Вікторыя( «Віншаванне з Беларусі».)

Мы заўсёды актыўна ўдзельнічаем у навагодніх выставах. Многа работ рыхтуюць навучэнцы на тэмы «Новы год», «Зіма», «Каляды», «Раство». Неаднаразова яны станавіліся пераможцамі гарадскіх конкурсаў «Рождественские фантазии», «Новогодний экспресс». У 2014 годзе Віжык Ксенія была ўзнагароджана дыпломам за першае месца ў гарадскім конкурсе «Белое золото зимы», Сарока Дар'я і Сарока Кацярына – дыпломам за II месца ў конкурсе дзіцячых работ «Калядная казка» ў музеі старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Некалькі разоў, у тым ліку і ў 2015 годзе, мы былі ўдзельнікамі выставы-конкурсу «Калядныя замалёўкі», што праводзіць Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

Вельмі адказна, старанна працуюць навучэнцы, рыхтуючыся да рэспубліканскай выставы-конкурсу «Калядная зорка». У 2013 годзе Бохан Анастасія была ўзнагароджана дыпломам III ступені за саламяную работу «Гадавы колаварот», у 2014 Бохан Анастасія і Мазуркевіч Елісей – дыпломам III ступені за серыю віншавальных паштовак у тэхніцы выцінанкі. У 2015 годзе Бохан Анастасія атрымала дыплом I ступені за работу-выцінанку «Зюзя», а Паскробка Яўгенія, Хурсін Міхаіл, Кабанава Аляксандра і Васілеўская Лізавета

– дыплом I ступені за незвычайныя, па-дзіцячы наіўныя, простыя, а магчыма ад гэтага «добрыя», «дамашнія», «сямейныя» навагоднія ёлачныя цацкі. Цырымонія ўзнагароджвання па выніках дадзенага конкурса асабліва ўрачыстая: прывітальныя словы прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, канцэрт ці спектакль, падарункі, найлепшыя пажаданні ад членаў журы. Дзеці асэнсоўваюць, што іх работа сапраўды адна з лепшых, што яны і праўда могуць займацца саломапляценнем ці выцінанкай, паказваючы высокія вынікі, а значыць трэба да гэтага імкнуцца, трэба выпрацоўваць свой творчы почырк, плённа выкарыстоўваючы творчыя здабыткі народных майстроў.

У 2015 годзе мы ўпершыню прынялі ўдзел у конкурсе «Жавароначкі, прыляціце!», што праходзіць у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Мінскім раёне. Так сталася, што тэма птушак для нас блізкая, таму і ў 2015, і ў 2016 годзе навучэнцы гуртка «Добры настрой» станавіліся пераможцамі. Іх узнагароджвалі падчас правядзення фальклорнага свята «Гуканне вясны». Я думаю, у гэты момант кожны з іх зразумеў, што варта было зноў і зноў вяртацца да работы, планаваць свае заняткі на доўгі час, бо вынік ёсць, добры вынік: высокая ацэнка, дадзеная іх рабоце дарослымі, і членамі журы, і проста наведвальнікамі музея.

Прымаем мы ўдзел і ў адкрытых конкурсах. У 2013 годзе Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі праводзіў адкрыты конкурс юных майстроў па выцінанцы. Каманда гуртка «Добры настрой» была ўзнагароджана дыпломам за лепшую прэзентацыю ў конкурсным заданні «Папяровы свет». Прафесійнае журы – прадстаўнікі маладзечненскай школы выцінанкі – адзначылі «свой почырк» нашых работ, а не простае капіраванне работ вядомых майстроў выцінанкі. Такая ацэнка натхніла дзяцей, і хаця гэта была пэўная няўдача (не атрымалі дыплом I–III ступені), яны пачалі ўпарта працаваць, з вераю ў перамогу. І перамаглі. У адкрытым гарадскім конкурсе па выцінанцы «Сняжынка–2014» – I месца; «Сняжынка–2015» – I месца.

Пра тое, як нашы навучэнцы ведаюць і выконваюць правілы дарожнага руху, сведчаць іх перамогі ў гарадскім этапе рэспубліканскага конкурсу «Соблюдаем законы дорог». У намінацыі «Дэкаратыўнае пляценне»: у 2013/2014 навучальным годзе Саладуха Дзмітрый быў узнагароджаны дыпломам І ступені, а Харэвіч Юлія – дыпломам ІІІ ступені; у 2014/2015 навучальным годзе Зіневіч Вікторыя атрымала грамату за ІІІ месца.

Хачу адзначыць, што навучэнцы нашай школы са сваімі работамі, выкананымі ў тэхніцы выцінанкі і саломапляцення, прымалі ўдзел у розных конкурсах дзіцячай творчасці: «Чароўныя ўзоры», «Пад сінім небам», «Поют жаворонки», «Залатая саломка», «Здравствуй, мир!».

Як вынік актыўнага ўдзелу ў конкурсна-выставачнай рабоце перамога ў міжнародным конкурсе «Интерфест–2015»: калектыўная работа «Калядоўшчыкі» (саломапляценне) – дыплом І ступені; серыя работ «Выцінанка» – дыплом ІІІ ступені.

Гардзейчук Ганна да міжнароднай алімпіяды мастацтваў «Куршинале–2016» падрыхтавала серыю работ «Беларусь хрысціянская» (выцінанка) па тэме алімпіяды «Мая Радзіма , ці Куточак, які мне дарагі». Ганна расказвала членам журы і ўдзельнікам алімпіяды з Арменіі, Казахстана, Расіі і іншых краін пра добрае, мірнае суседства ў Беларусі людзей розных веравызнанняў; пра тое, што на працягу стагоддзяў у цэнтры многіх беларускіх мястэчак і гарадоў стаяць цэрквы, касцёлы, сінагогі, мячэці. Чатыры касцёлы і чатыры царквы – помнікі архітэктуры Беларусі – як сімвалы мірнага жыцця ў дарагім для аўтара куточку зямлі. Ганну не проста ўважліва слухалі, яе работамі захапляліся і жадалі плённай працы ў далейшым.

Выраб творчых індывідуальных і калектыўных работ ў тэхніцы саломапляцення і выцінанкі адбываецца праз далучэнне навучэнцаў да іншых відаў беларускага народнага мастацтва, да фальклору, рамёстваў, звычаяў і абрадаў, мовы і літаратуры, гісторыі і міфалогіі, архітэктуры і побыту; праз знаёмства з асаблівасцямі нацыянальнага касцюма, беларускай кухні, народнага календара. Такім чынам у навучэнцаў фарміруюцца важнейшыя духоўныя

якасці, патрыятычныя пачуцці, эстэтычны густ. Стварыць цікавую, у нечым новую работу, вельмі няпроста. Мы ўвесь час знаходзімся ў творчым пошуку незвычайнага прымянення звычайных, традыцыйных, вядомых усім прыёмаў пляцення і тэхнік выразання.

Майстар-класы. Удзел у такіх мерапрыемствах спрыяе павышэнню самаацэнкі. Навучэнцам прыемна адчуваць сябе ў ролі настаўніка, дзяліцца сваімі ведамі і ўменнямі з іншымі дзецьмі і, асабліва, з дарослымі. Мы праводзілі дэманстрацыйны майстар-клас па вырабу саламянага «павука» ў Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту ў студзені 2015 года падчас фальклорнага свята «Шчадруха – калядная весялуха». Напрыканцы падарылі павук у фонды Музея. Падзяка ад дырэктара і супрацоўнікаў Музея–высокая ацэнка работы навучэнцаў.

Майстар-клас па выцінанцы мы правялі ў рамках адкрыцця выставы «Калядная казка» ў музейным комплексе «Дудуткі» (2014 г.). Чатыры майстар-класы, два па выцінанцы і два па саломапляценні, былі праведзены намі ў «Дудутках» падчас фальклорнага свята «Гуканне вясны» (2015 г.). З мастацтвам саломапляцення мы знаёмілі студэнтаў БНТУ на майстар-класе ў дзень адкрыцця выставы «Каб вярталіся птушкі дамоў».

Асобная старонка ў нашай рабоце – шматгадовае супрацоўніцтва з часопісам «Ксюша. Умелые ручки. Для любителей рукоделия». Калі работа юнага майстра прызнаецца дастойнай для публікацыі, думаю, да аўтара прыходзіць асэнсаванне дасягнення пэўнага поспеху у дадзенай галіне дзейнасці.

Адна з асаблівасцей нашай работы – удзел у гарадскім праекце па падтрымцы таленавітых і адароных дзяцей «Маладыя таленты сталіцы», які падразумявае арганізацыю, афармленне, правядзенне персанальных выстаў навучэнцаў, што маюць шэраг перамог у гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і неабходную для выставы колькасць работ. Падчас адкрыцця такіх выстаў аўтары абавязкова праводзяць майстар-класы для навучэнцаў сярэдніх школ і цэнраў дадатковай адукацыі г. Мінска. Гэта надта

адказнае, сур'ёзнае і ў той жа час пачэснае і для аўтара, і для педагога мерапрыемства, якое праходзіць у Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі.

У 2013 годзе адбылася персанальная выстава сясцёр Сарока Дар'і і Сарока Кацярыны па саломапляценні. Дзяўчынкі вучылі ўдзельнікаў майстар-класа выконваць традыцыйнае пляценне на каркасе і расказвалі пра яго прымяненне ў вырабах народных майстроў у даўніну і ў сучасных вырабах.

У 2014 годзе наведвальнікі Мінскага дзяжаўнага палаца дзяцей і моладзі пазнаёміліся з творчымі работамі ў тэхніцы выцінанкі, якія выканала навучэнка гуртa «Добры настрой» Маслоўская Вікторыя. Аўтар выставы правяла два майстар-класы. Падчас першага майстар-класу «Краскі восені» яна вучыла ўпрыгожваць вырабы выразанымі з паперы лісточкамі розных дрэў, а другі быў прысвечаны навагодняй тэматыцы.

У 2015 годзе парадаваў усіх сваімі творамі незвычайны юнак – чатырнаццацігадовы Саладуха Дзмітрый. На адкрыццё яго персанальнай выставы завітаў увесь 9 «В» клас, які дапамог Дзмітрыю не толькі правесці майстар-клас па вырабу саламяных кветак, але і паказаць частку абраду «Зажынкі».

Лічу, што такая падзея пакінула ў жыцці кожнага аўтара добры след. Лічу не без падставы: Сарока Дар'я ў свае семнаццаць гадоў стала маёй калегай – майстрам народнай творчасці, бо была прынята ў склад ГА «Беларускі саюз майтроў народнай творчасці» рашэннем праўлення ад 26.01.2015 г.

А яшчэ я лічу, каб развіваць матывацыю дасягнення поспеху у навучэнцаў, педагог павінен быць матываваным на поспех сам. Таму я і сама як педагог і майстар народнай творчасці прымаю актыўны ўдзел у конкурсна-выставачнай рабоце, у семінарах-практыкумах, майстар-класах.

Павінна прызнаць, што калі ў навучэнцаў матывацыя да заняткаў саломапляценнем і выцінанкай становіцца высокай, то для падтрымкі гэтага ўзроўню, а тым больш для яго развіцця, ад настаўніка спатрэбіцца нямала інтэлектуальных, часавых, эмацыянальных затрат. Аднак я ўпэўнена, што ўсім

творчым асобам, якія працуюць у сферы адукацыі непасрэдна з дзецьмі, гэта добра вядома і яны гэтага не баяцца. Галоўнае – вынік работы.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Кодекс Республики Беларусь об образовании** [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kodeksy-by.com/kodeks_ob_obrazovanii_rb/2.htm. – Дата доступа: 14.09.2016.

2. **Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи.** Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 15 июля 2015 № 82 [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://adu.by/wp-content/uploads/2015/umodos/koncept-vospit-detej-i-molodioji.doc. – Дата доступа: 07.09.2016.

3. **Пакулина, С. А.** Методика диагностики мотивации достижения успехов студентов в вузе / С. А. Пакулина // Психология обучения. – 2009. – № 1. – С. 102–113.

4. **Хекхаузен, Х.** Психология мотивации достижения / Х. Хекхаузен; пер. с англ. – СПб.: Речь, 2001.

5. **Лобачевская, О. А.** Плетение из соломки / О. А. Лобачевская. – М.: Культура и традиции, 2000.

6. **Репина, Т. А.** Художественные изделия из соломки / Т. А. Репина. – Минск: Беларусь, 2006.

7. **Сахута, Я. М.** Беларуская выцінанка / Я. М. Сахута. – Минск: Беларусь, 2008.

8. **Сахута, Я. М.** Беларускае народнае дэкаратыуна-прыкладное мастацтва / Я. М. Сахута. – Минск: Беларусь, 2001.

**Дадатак 1**

## Пытанні віктарыны «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, рамёствы і звычаі беларусаў»

1. Са старажытнасці да сяр. 20 ст. у некаторых раёнах Беларусі гэты занятак, што перарос у рамяство, лічыўся жаночай справай і на мужчын, якія займаліся ім, глядзелі з пагардай, бо тыя павінны былі вырабляць такія рэчы (у першую чаргу посуд) з іншых матэрыялаў – дрэва. Што гэта за рамяство? **(Ганчарства.)**

2. Пакуль гаспадар-ганчар круціў розны посуд, гаспадыня і дзеці ляпілі качак, пеўняў, бараноў, коней, лялек і г. д. і абпальвалі такія вырабы разам з посудам. А потым прадавалі (рыначны эквівалент такога вырабу – адно курынае яйка). Прадавалі танна, таму ляпіць трэба было хутка і ў вялікай колькасці. Такія вырабы ёмка змяшчаліся ў далонь і не разбіваліся, нават упаўшы на зямлю. За што і кім цаніліся такія вырабы? *(Цаніліся дзецьмі за залівісты свіст. Размова ідзе пра гліняную цацку.)*

3. Гэты матэрыял даступны для многіх жыхароў Беларусі. Шырокі дыяпазон вырабаў выклікаў разнастайнасць яго апрацоўкі: дзяўбанне,тачэнне, разьба, выпальванне, свідраванне,таніраванне, паліраванне, афарбоўка, роспіс, інкрустацыя і інш. Найбольшую цікавасць з мастацкага боку ўяўляюць традыцыйныя дзяўбаныя і разьбяныя вырабы, перш за ўсё прылады працы і посуд. Пра што ідзе размова? Прывядзіце прыклады вырабаў. *(Дзяўбаныя: ступы, начоўкі, кадушкі, вуллі, чаўны; сальнічкі, лыжкі, міскі, ступкі, карцы, чарпакі. Разьбяныя: прасніцы, формы для выпечкі пернікаў, вільчакі, закрыліны, карнізы, ганкі, вуглы, ліштвы; фігуркі «багоў».)*

4. На пачатку 20 стагоддзя адзін з даследчыкаў побыту беларусаў запісаў : «Пояс, як відаць, складае неабходную прыналежнасць якога б там ні было гарнітура. Уважлівы мужчына без пояса не пераступіць парог сваёй хаты і не

з`явіцца на вуліцы». Чаму? Па якой прычыне негатыўнае адценне ў рускай мове мае слова «распоясаться», а ў беларускай мове «расперазацца». (*Слова «расперазацца» захоўвае ўяўленні пра чалавека, які адмовіўся ад агульнапрынятых нормаў і правіл).*

5. Выцінанка як від народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці перажывала ў Беларусі перыяды росквіту і забыцця, але ў наш час выцінанкай зноў сталі цікавіцца многія: мастакі, майстры, навучэнцы, гурткоўцы. Дзе і ў сувязі з чым з` явілася мастацтва стварэння ўзораў з паперы*? (У старажытным Кітаі ў сувязі з вынаходніцтвам паперы.)*

6. Лёгкасць, пластычнасць у вільготным стане, чысты залацісты колер з мноствам адценняў, глянцавы бляск, а таксама таннасць і даступнасць. Пра якІ матэрыял ідзе размова і чаму яго называлі «сялянскім»? *(Салома. Знаходзіла самае шырокае, універсальнае прымяненне ў гаспадарцы, побыце і абрадах земляробаў.)*

7. Мастацтва гліны і агню – гэта вобразнае азначэнне керамікі – вырабаў з гліны, якія абпальваюцца для моцы і вадастойкасці. У беларускім народным побыце гэта быў галоўным чынам розны гаспадарчы посуд, выраб якога называлі ганчарствам, а майстроў – ганчарамі. Для чаго прызначаліся наступныя ганчарныя вырабы:

- ✓ гаршчок (гатаванне ежы ў печы);
- ✓ збанок(для захоўвання малака);
- ✓ міска(для яды);
- ✓ макацёр(для расцірання маку);
- ✓ слоік(для мёду, варэння, саленняў);
- ✓ гляк(для алею, квасу, вады).

8. Гэтага майстра ў вёсцы ўсе зналі, паважалі Ібаяліся, ім ганарыліся, яго шанавалі і цанілі. Праца гэтага чалавека заўсёды была акружана арэолам таямнічасці і загадкавасці, а яго самога параўноўвалі з чараўніком, які валодае цудадзейнымі сакрэтамі апрацоўкі непадатлівага матэрыялу. Яго майстэрня

звычайна стаяла наводдаль ад жылля, як правіла, каля вады. Хто гэта? Што ён вырабляў? *(Каваль. Падковы, сярпы, клямкі, завесы, брычкі, вазкі, крыжы, замкі і г.д.)*

9. Вышыўка як від дэкаратыўнага мастацтва мае даўняе паходжанне. Усе віды вышыукі выконваліся на белым ільняным фоне вырабу чырвоным колерам, часам з дадаткам чорнага. Адкуль такая каларыстыка? *(Белы фон – натуральны колер палатна, чырвоны ў славян лічыўся сімвалічным як колер сонца, жыцця. А паколькі жыццё не вечнае, то і чорнага крыху дадавалі.)*

10. Вышыванне было заняткам дзяўчыны. Вышывалі дома, вышывалі і на вячорках. Вышыўка бытавала выключна ў форме хатніх заняткаў, якія задавальнялі патрэбы сям`і. Іншы раз вышыўку выконвалі талакой. Напрыклад , каб своечасова падрыхтаваць наебходныя абрадавыя рэчы да вяселля. Усёй грамадой аздаблялі вышыўкай і ручнік – абыдзённік, вытканы групай жанчын за адну ноч ці дзень. З якой мэтай стваралі такі ручнік? *(Для прадухілення сваёй вёскі ад пошасці, эпідэміі, засухі, градабою.)*

11. Традыцыі мастацкага роспісу ў Беларусі не вельмі багатыя. Аднак існуюць пісанкі – узоры народнага мастацкага роспісу, якія маюць вельмі старажытнае, яшчэ язычніцкае паходжанне. Якія народныя ўяўленні ўвасаблялі ў сабе курыныя яйкі? У якасці якога сімвала ўжывалі іх у вясновых абрадах старажытныя славяне? Як называецца спосаб упрыгожвання пісанак? *(Курыныя яйкі ўвасаблялі народныя ўяўленні пра творчыя, жыццёвыя сілы прыроды. Ужыванне іх у вясновых абрадах – гэта сімвал абуджэння прыроды пасля зімовага сну, сведчанне чалавечага дабрабыту і згоды. Васкаванне.)*

**Дадатак 2**

# НЕЗВЫЧАЙНАЯ КВЕТКА

Якжык Вераніка

Недалёка ад вялікага горада быў лес, у лесе паляна, на якой раслі розныя лясныя кветкі. У добрае надвор’е на паляну прылятaлі матылі, а ў траве цвыркалі конікі. Кветкі былі знаёмыя даўно, з часу свайго з’ яўлення на свет. Яны раслі, часта гутарылі адна з адной, жартавалі, гулялі ў хованкі і шарады.

Аднойчы на паляне з’ явілася новая кветка, на тоненькай сцябліне, з маленькімі лісцікамі і вельмі маленькім зялёным бутонам.

– Ты падобна на звычайную траву!, - сказалі вялікія чырвоныя Макі.

– Не, не! Я – кветка! Я – незвычайная кветка!

– Такіх кветак не бывае!, - зазвінеў весялун і балака Званочак.

– Якая ж ты кветка, калі твой бутон не раскрыўся?!, - спытаў какетлівы Рамонак. – Глядзі, якая ў мяне кветка з жоўтай сярэдзінкай. Я падобны на сонца.

Маленькай кветцы стала сумна, холадна і самотна ... Яна ўжо зусім завяла ад суму, як раптам пайшоў цёплы летні дождж ...

Раніцай наступнага дня здарыўся цуд! У незвычайнай кветкі раскрыўся бутон. Ён быў сіняга колеру, як глыбокая вада ў рацэ, а кожны яго пялёстак нагадваў вытанчаныя карункі. Ён не быў падобны ні на адну кветку, якая жыве наляснoй паляне. Праз дзень на тоненькай сцяблінцы раскрылася яшчэ чатыры бутоны. Кветка выдавала незвычайна прыемны водар, які разносіўся далёка за межы паляны. На радасныя галасы кветак прыляцелі птушкі і зашчабяталі, што нідзе і ніколі не сустракалі такую выдатную і незвычайную кветку. Па раніцах ёй любавалася таропкая зайчыха, мядзведзь перастаў палохаць сваім рыканнем лясных жыхароў, і лес здаваўся не такім ужо змрочным...

Уся лясная паляна была зачараваная прыгажосцю незвычайнай кветкі, і на маючым адбыцца балі кветак яе абралі Каралевай.

Незвычайая кветка была шчаслівая яшчэ і таму, што выстаяла, не зламалася, не страціла надзею, калі ей было вельмі дрэнна, змагла знайсці ў сабе сілы раскрыць свае пялёсткі ў самы цяжкі момант і была ўдзячна дожджыку, які ёй ў гэтым дапамог.